Вольга СВІРЫДОВІЧ

**Для гараджан і турыстаў пешаходная вуліца – гэта перш за ўсё камфортнае месца, дзе можна праводзіць час і адчуць непаўторны настрой горада. Такія вуліцы ёсць у многіх гарадах свету, і, як правіла, яны абавязкова трапляюць на першыя пазіцыі ў турыстычных даведніках. Беларусь – не выключэнне. Некаторыя з «пешаходак» маюць даволі багатую гісторыю, а некаторыя з'явіліся адносна нядаўна, але арганічна дапоўнілі гарадскі каларыт.**

**У чарговым выпуску праекта прагуляемся па пешаходных вуліцах у розных куточках Брэстчыны, узгадаем іх гісторыю і пабачым, як яны змяняліся ў розныя перыяды гісторыі.**

# ПІНСК

## *Шпацыр па Газу*



У 2014 годзе да абласных «Дажынак», якія праходзілі ў Пінску, у горадзе вырашылі ўладкаваць пешаходныя вуліцы. Такімі сталі ўчасткі вуліц Леніна і Першамайскай, а таксама плошча Леніна. Дарэчы, прапановы зрабіць вуліцу Леніна пешаходнай выказваліся яшчэ ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

Вуліца, якая цяпер носіць імя Леніна – самая старажытная ў Пінску. Яе працягласць складае 800 метраў. За час свайго існавання яна ўжо змяніла некалькі назваў: спачатку называлася Вялікай Спаскай, затым – Вялікай Францысканскай, Вялікай Кіеўскай. У 20-х гадах мінулага стагоддзя насіла імя Касцюшкі, а падчас нямецкай акупацыі атрымала назву Вялікай.

Пешаходная вуліца нездарма лічыцца адной з ключавых славутасцяў Пінска: практычна на ўсіх будынках, якія тут можна ўбачыць, размешчаны таблічкі «Гісторыка-культурная каштоўнасць». Яны ўяўляюць сабой узор гарадской забудовы мяжы стагоддзяў – канца XIX – пачатку XX ст., якая выдатна захавалася.

Цікава, што збіраючыся прагуляцца па вуліцы, якая тады яшчэ насіла імя Касцюшкі, пінчукі казалі: «Ідзем шпацыраваць па Газу». У гэтым шыфры намяшаны і польскія, і яўрэйскія словы: Газам называлі галоўную, вялікую вуліцу. Дарэчы, слова «шпацыраваць» сустракаецца ў якасці гутарковага ў беларускай мове, а «шпацыр» – не што іншае, як прагулка пешшу.

Цяпер у пачатку вуліцы стаіць бронзавы помнік жыхару горада – пінчуку. Гэта каларытны вобраз тыповага моцнага палешука ў характэрнай для тутэйшых ганарлівай позе і з асаблівым жэстам рукі. На пастаменце можна прачытаць «Па-першае, я з Пінска...». Лічыцца, што менавіта па загнутым мезенцы і гэтай фразе пазнаюць карэнных пінчукоў.



Пинскъ — Кіевская ул.
Pińsk — Ul. Kijowska